CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

**WYPEŁNIA ZDAJĄCY**

KOD | PESEL

*Miejsce na naklejkę.*
*Sprawdź, czy kod na naklejce to* **E-100**.
*Jeżeli tak – przyklej naklejkę.*
*Jeżeli nie – zgłoś to nauczycielowi.*

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM PODSTAWOWY

DATA: **20 maja 2021 r.**
GODZINA ROZPOCZĘCIA: **9:00**
CZAS PRACY: **170 minut**
LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **50**

**WYPEŁNIA ZESPÓŁ NADZORUJĄCY**

Uprawnienia zdającego do:

☐ dostosowania zasad oceniania.

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 13 stron (zadania 1–9). Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Odpowiedzi zapisz w miejscu na to przeznaczonym przy każdym zadaniu.
3. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
4. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
5. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.
8. Możesz korzystać ze słowników językowych.

EMBB-P0-**100**-2105

Układ graficzny
© CKE 2021

**Przeczytaj tekst i wykonaj zadania 1.–3.**

Яўген Вапа
***А ў пушчы сіла***

“Я е“[1] – ці ж гэта не самы кароткі сказ, які мне прыдумаўся пра нашу зямную прысутнасць. Скланяць слова-літару “е” таксама файная моўная гульня. Пішу менавіта ў настроі моўна-слоўных разважанняў, бо апошнія выхадныя правёў я ў кампаніі людзей пяра, для якіх кожнае слова не з’яўляецца пустым гукам.

На фоне прыроды ўсе нашы размовы пра жыццё і літаратуру кружылі вакол лёсу пушчанскіх людзей і гісторыі. Я адчуў проста, што знаходжуся ў самым эксклюзіўным купэ цягніка, які называецца пушчанскі дух. Такі наш “Арыент-экспрэс”, у якім даецца месца кожнаму, хто захоча, без вялікіх грошай.

Свет дарыў сонца, водар вясны, шаленства птушынага спеву. […]

Нашы шпацыры па пушчы былі дапаўненнем таго шчасця, якое называецца свабодай. А можа менавіта так выглядае рай для нас, пушчанскіх беларусаў.

Цікава, калі пастукаем у нябесныя вароты, ці ахоўнікі зразумеюць, калі будзем гаварыць па-свойму? Але ж такіх нацыянальнасцей, як мы, ёсць сотні і, здаецца, на шчасце, Бог разумее ўсе мовы. [...]

Менавіта прырода, добрая кампанія [...] увялі нас у свет рэальнасці і магічнасці. [...]

Так, што калі вы, дарагія чытачы, хочаце пражыць неверагодныя гісторыі, дык абавязкова паедзьце ў нейкае пушчанскае зацішша і паддайцеся той наканаванасці, якая напэўна кожнаму падыме адрэналін. І можаце яшчэ наслухацца незвычайных расказаў пра зуброў, дзікоў, баброў, ад якіх вам стане не толькі страшна, але часам і трагікамічна.

“Мы е”, – падумалася мне, хаця ляжым на могілках. Усе мы туды трапім, але ці памяць пра адышоўшых не будзе таксама знікаць у наступных пакаленнях. Сустрэтая на могілках суседка нават засумнявалася, ці будзе яшчэ хтосьці ахвотны, каб правесці нас у апошнюю дарогу. Вось рэальнасць сённяшняга чалавечага вымярэння. Таму, каб не здарылася з намі такое, сябруйце людзі з сабою. А тады і пражыць жыццё будзе ўсім нам лягчэй.

Я. Вапа, *А ў пушчы сіла*, “Ніва”, № 23, 2017, с. 2.

**Заданне 1. (0–2)**
**Растлумач уласнымі словамі значэнне словазлучэнняў, якія выступаюць у тэксце.**

людзі пяра – ..........................................................................................................

пусты гук – ............................................................................................................

нябесныя вароты – ................................................................................................

свет магічнасці – ...................................................................................................

[1] Я е – рэгіяналізм, значыць: я ёсць.

## Заданне 2. (0–2)

**Знайдзі ў тэксце і падай антонімы да наступных слоў:**

адсутнасць – ...................................................................................................................

рэальнасць – ...................................................................................................................

з'яўляцца – ....................................................................................................................

браць – ..........................................................................................................................

## Заданне 3. (0–2)

**Ацані праўдзівасць прыведзеных сцверджанняў на аснове тэксту *А ў пушчы сіла*. Калі сказ праўдзівы, пазнач П, калі непраўдзівы – Н.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | "Я е" – гэта самы кароткі сказ, які прыдумаўся аўтару, калі ён падумаў пра вечнае жыццё. | **П** | **Н** |
| **2.** | Пачуццё сапраўднага шчасця і свабоды людзям, якія нарадзіліся побач з пушчай, дае кантакт з прыродай. | **П** | **Н** |
| **3.** | Для людзей пяра кожнае слова важнае і мае асаблівае значэнне. | **П** | **Н** |
| **4.** | На фоне прыроды ўсе размовы пра жыццё і літаратуру кружылі вакол лёсу пушчанскіх звяроў і сучаснасці. | **П** | **Н** |

## Przeczytaj tekst i wykonaj zadania 4.–8.

Юрый Хлапонін

***Мова і нацыянальная свядомасць***

Як вядома, развіццё чалавецтва трымаецца на яго разнастайнасці. Перш за ўсё, маецца на ўвазе рознасць моў, культуры, тэрытарыяльных асаблівасцей, гісторыі.
З гэтага складаецца працэс стварэння асобнай нацыі, дзяржавы, асэнсавання кожнага чалавека як яе часткі.

Цікава толькі, з чаго пачынаюцца ўсе гэтыя працэсы? Мне заўсёды падавалася – асноўную ролю ў гэтым адыгрывае мова, такая, здавалася б, звычная сістэма рэчаў у паўсядзённым жыцці. Але гэта, тое што ўласціва толькі людзям, дазваляе нам вызначаць як адну, вялікую (ці не вельмі) групу, адрозніваць сябе ад іншых людзей па іх мове, культуры, ладу жыцця.

Адным словам, пытанне ў тым – ці сапраўды мова вызначае свядомасць чалавека, ці наадварот, свядомасць пад уплывам навакольных умоў уплывае на фармаванне мовы. […]

Спачатку, паясняць уплыў мовы на нацыянальную свядомасць можна, звярнуўшыся да сацыяльнай псіхалогіі: мова дае магчымасць ідэнтыфікаваць сябе з пэўнай групай, якая гэтую мову і выкарыстоўвае. […]

Калі адбываецца моўная ідэнтыфікацыя чалавека, ён пачынае супрацьстаўляць сваю мову іншым, асабліва калі ён знаходзіцца ў сітуацыі шматмоўнага асяроддзя.

Далей, […] псіхолаг Леў Выгоцкі паказвае суадносіны мовы і мыслення так: па-першае, яны маюць align рознае генетычнае развіццё і таму ідуць па розных шляхах адзін ад аднаго.

Потым, з цягам часу, мысленне “афармляецца” словамі, а мова набывае асэнсаванне, адбываецца яе інтэлектуалізацыя. Пры гэтым, на думку Выгоцкага і яго паслядоўнікаў, крыніцай моўнага развіцця з’яўляецца не прыроджаны характар, а дзейнасць і правілы дзейнасці. Такім чынам, мова – паказчык, які адлюстроўвае аб’ектыўную рэчаіснасць. На ўздзеянне зместу слоў уплывае асяроддзе.

Ёсць яшчэ адна навуковая спроба даказаць уплыў мовы на нашу свядомасць – гіпотэза лінгвістычнай адноснасці. Згодна з ёй, мова вызначае мысленне і пазнанне рэчаіснасці, уплывае на светапогляды.

Адзін з аўтараў гэтай гіпотэзы, Эдуард Сепір, кажа: у мове ўтрымліваюцца ключы для разумення розных нацыянальных светапоглядаў. У граматычных сістэмах у свеце няма дзвюх моў, якія былі б падобныя адна да адной дастаткова, каб забяспечыць ідэальны пераклад.

Ю. Хлапонін, *Мова і нацыянальная свядомасць*, “Наша слова”, № 39, 2019, с. 2.

**Заданне 4. (0–1)**

**Прапануй і запішы загаловак да тэксту ў форме пытання.**

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

**Заданне 5. (0–1)**

**Да кожнага слова 1–3 выберы і дапасуй яго значэнне А–Г. Адказ упішы ў адпаведнае поле.**

| | |
|---|---|
| **1.** свядомасць | **А.** Навуковавае меркаванне, якое прыводзіцца для тлумачэння тых ці іншых з’яў і патрабуе праверкі на вопыце, перш чым стаць навуковай тэорыяй. |
| **2.** гіпотэза | **Б.** З’ява, якая адносіцца да гіпнатызавання, да гіпнозу, майстэрства гіпнозу. |
| **3.** светапогляд | **В.** Успрыманне і разуменне навакольнага, уласцівае чалавеку. |
| | **Г.** Сістэма поглядаў на жыццё. |

1 .............. , 2 .............., 3 ..............

**Заданне 6. (0–3)**

**Напішы рэзюмэ да тэксту аб’ёмам 40–60 слоў.**

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

**Заданне 7. (0–1)**

**Ацані адпаведнасць прыведзеных сцверджанняў інфармацыі, пададзенай у тэксце. Пазнач ТАК, калі сцверджанне адпавядае тэксту, НЕ – калі не адпавядае.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | На думку Эдуарда Сепіра, у свеце няма дзвюх моў, дастаткова падобных адна да адной, каб забяспечыць дакладны пераклад. | **ТАК** | **НЕ** |
| **2.** | Сацыяльныя псіхолагі мяркуюць, што чалавек атаясамліваецца з групай, якая карыстаецца той жа мовай, што і ён. | **ТАК** | **НЕ** |
| **3.** | Асяроддзе, якое акружае чалавека, не ўплывае на ўспрыманне значэння слоў. | **ТАК** | **НЕ** |

**Заданне 8. (0–1)**

**Закончы сказ. Выберы і пазнач правільны адказ сярод пададзеных варыянтаў.**

Словазлучэнне *ключы для разумення* – гэта

**А.** параўнанне.

**Б.** анафара.

**В**. гукаперайманне.

**Г.** метафара.

**Заданне 9. (0–37)**
**Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie**

**Тэма 1. У чым заключаецца асаблівая сувязь чалавека з малой айчынай? Паразважай над пытаннем, абапіраючыся на фрагмент паэмы Якуба Коласа *Новая зямля*, увесь твор і выбраны тэкст культуры. Твая праца павінна налічваць не менш за 250 слоў.**

Якуб Колас
***Новая зямля***
(урывак)

XVIII. *Зіма ў Парэччы*

Далёка я ад межаў родных
І дзён галодных і халодных
Пражыў нямала. Я гадаю,
Я родны край успамінаю,
Я ім жыву, я ў ім душою
І сэрцам кожнаю парою,
Як той нявольнік прагне волі,
Так прагну я ступіць на ролі
Сваіх палеткаў, ніў благенькіх,
Дарог і сцежачак крывенькіх,
Што гожа ўюцца спомеж жыта
Або срэдзь лесу самавіта.
І ўстануць з'явы, як жывыя,
Малюнкі сэрцу дарагія,
І моцна душу парываюць.
“Ідзі да нас! ідзі”, – гукаюць.
Благаслаўёны час той будзе,
Калі я ў родным сваім людзе
Куточак бацькаў прывітаю
І радасць жыцця там пазнаю.

О родны край! О край пакуты,
Нягодай цяжкаю прыгнуты!
Калі ж ты збудзеш тое гора,
Што і цяпер там, як і ўчора,
Як і даўней, цябе знішчае
І горкім смуткам авявае?
І ў час вялікі разбурэння
Не сцерпіць нават і каменне
Тваіх палёў, глухіх абшараў,
Дзе след вайны агнём пажараў
Пранёсся дзіка і няшчадна,
Каб не заплакаць з таго здзеку,
Што чалавек – звер чалавеку –
Так злосна чыніць, неўспагадна!..

О край мой мілы! Ўсёй душою
Хачу злучыцца я з табою,
Ў тваіх палях пазычыць сілу,
Ў тваёй зямлі сысці ў магілу...
Дзяціны час!.. Я памятаю
Зімы прыход у нашым краю.
Стаіць над лесам шум маркотны;
Па небе хмары, як палотны,
Паўночны вецер рассцілае,
І бель над далямі звісае,
І ціха стане на падворку,
І лес жалобную гаворку,
Свой гоман восені канчае
І моўчкі зіму сустракае.
А сетка белая гусцее
І бліжай, бліжай снегам сее.
І вось над хатай, над гуменцам
Сняжынкі жвавыя гуляюць,
Садок і дворык засцілаюць
Бялюткім, чыстым палаценцам.
І тут у хаце не ўтрываеш:
Кажух на плечы накідаеш,
Бяжыш на двор, як той шалёны,
Крычыш, гукаеш здавалёны,
Зямлі не чуеш пад сабою
І ловіш белы пух рукою.

Я. Колас, *Новая зямля*, knihi.com

**Тэма 2. Зрабі аналіз верша. Пастаў інтэрпрэтацыйны тэзіс і абгрунтуй яго. Твая праца павінна налічваць не менш за 250 слоў.**

Якуб Колас
***Родныя вобразы***

Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае?
Чым так прыкованы я

К вам, мае ўзгорачкі роднага поля,
Рэчкі, курганы, лясы,
Поўныя смутку і жальбы нядолі,
Поўныя сумнай красы?

Толькі я лягу і вочы закрыю,
Бачу я вас прад сабой.
Ціха праходзіце вы, як жывыя,
Ззяючы мілай красой.

Чуецца гоман мне спелае нівы,
Ціхая жальба палёў,
Лесу высокага шум-гуд шчаслівы,
Песня магутных дубоў...

Вобразы мілыя, вобразы смутныя,
Родныя вёскі і люд,
Песні цягучыя, песні пакутныя!..
Бачу і чую вас тут.

1908

Я. Колас, *Родныя вобразы*, knihi.com

# WYPRACOWANIE

**na temat nr....................**

.........................................................................................................................................................

.........................................................................................................................................................

.........................................................................................................................................................

.........................................................................................................................................................

.........................................................................................................................................................

.........................................................................................................................................................

.........................................................................................................................................................

.........................................................................................................................................................

.........................................................................................................................................................

.........................................................................................................................................................

.........................................................................................................................................................

.........................................................................................................................................................

.........................................................................................................................................................

.........................................................................................................................................................

.........................................................................................................................................................

.........................................................................................................................................................

.........................................................................................................................................................

.........................................................................................................................................................

.........................................................................................................................................................

**Tabelę wypełnia egzaminator!**

| | | Liczba punktów | Suma | Uzasadnienie przyznania 0 punktów |
|---|---|---|---|---|
| rozprawka | A. | 0 – 3 – 6 | | |
| | B. | 0 – 4 – 6 – 9 – 12 | | |
| interpretacja | A. | 0 – 2 – 4 – 6 | | |
| | B. | 0 – 4 – 8 – 12 | | |
| | C. | 0 – 1 – 2 | | |
| | D. | 0 – 2 – 4 | | |
| | E. | 0 – 1 – 2 | | |
| | F. | 0 – 1 – 3 | | |
| | G. | 0 – 2 – 4 | | |
| | H. | 0 – 2 – 4 | | |

## BRUDNOPIS *(nie podlega ocenie)*